Год II. Пятніца, 4 сакавіка (марца) 1921 г. № 9.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднева газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. | Цана асоб. нумэру 6 марак. | Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Дзеляць Беларусь.

Рыга, 25 марца. У пытаньні аб граніцах тэрыторыяльная камісія выказалася за уступку Польшчы 3.000 кв. кілеметраў у Вялейскім павеце і на Валыні. (Тэл. аг. О.)

Хто больш-менш сачыў за ходам польска-бальшавіцкіх перагавораў у Рызе, мусіў прыйсьці да перакананьня, што ні тая, ні тая старана шчыра не гаворыць, а проста—„водзяць адзін другога за нос". Хто каго перагаворыць, хто каго перахітрує,—вось, здавалася, увесь сэнс гэтых нескачнальных перагавораў у Рызе. Здавалася, што хіба толькі канец сьвету адаб'е ахвоту у Рыжскай канфэрэнцыі весьці далей безнадзейныя перагаворы. Ажно—на табе: варта было бальшавікам адступіць на карысьць палякоў яшчэ якіх-небудзь 3.000 кілёметраў беларускай і украінскай зямлі, як тэлеграф абвесьціў, што „работы рэдакцыйнай камісіі па усіх пытаньнях будуць скончаны стараньнямі абедзьвюх дэлегацый" к 1 сакавіку (марцу) г. г. Усё гэта, калі яно праўда, будзе неспадзяванкай. Але ня ў тым рэч. Нас цікавіць тут тое, што і Савецкая Расея і Польшча ў сваёй палітыцы сталі зусім выразна кіравацца не якімі-небудзь ідэёвымі прынцыпамі, а чыста рэальнымі выгодамі.

Маскоўскія бальшавікі толькі прыкрываліся прыгожымі словамі аб прызнаньні правоў кожнага народу па самавызначэньне. На практыцы яны заўсёды аставаліся звычайнымі імпэрыялістамі, толькі на свой, камуністычны, лад

У Польшчы цяпер таксама пануюць імпэрыялістычныя пагляды, якімі кіруецца і польскі урад. Кіруючым польскім палітыкам сучаснага мамэнту здаецца, што найлепшым мірам будзе такі, які адсуне ўсходнія граніцы Польшчы як найдалей на ўсход, калі можна да Дняпра, а калі не, то хоць бы гдзе, але як можна толькі далей на ўсход ад этнографічнай беларуска-польскай граніцы па Бугу і Нараву.

Такім чынам сучасныя Польшча і Савецкая Расея, як яны адна да аднэй непадобны ні з якога іншага боку, сходзяцца ў тым, што абедзьве вядуць імпэрыялістычную палітыку, каторая ня лічыцца з правамі аддзельных народаў на незалежнасьць і непадзельнасьць.

Камуніст Іофэ і „буржуй" Домбскі—тыповыя прадстаўнік сучасных палітыкаў-імпэрыялістаў. Яны гандлююць тэрыторыяй Беларусі і Украіны, як сваей.

У адносінах да правоў цэлага народу на сваю тэрыторыю дапушчаецца самая яўная і страшная несправядлівасьць. Як іначай можна назваць гэты магчымы акт падзелу Беларусі паміж Польшчай і Расеяй?

Беларусы горача пратэстуюць проціў гэтае магчымасьці ў Рызе і ніколі не паміріцца з ёю.

В—к.

Запаведзь новае улады.

Ліга Народаў ужо абвесьціла ў ноце сваей да Літоўскага ураду, што на час плебісцыту ў нашым краю мае быць заведзена адміністрацыя, зложаная з прадстаўнікоў вялікіх дзяржаў, — трэба думаць, з учасьцем тутэйшага грамадзянства ўсіх нацыянальнасьцей. Вестка гэта паказвае, што трэба чакаць у хуткім часе стварэньня новай ў нас ўлады — гэтым разам міжнароднай.

Праўду кажучы, зьмена незалежнага упраўленьня „Сярэдняе Літвы" ўжо адбываецца: ліквідуе яго Польшча, забіраючы ў свае рукі галоўнае кіраўніцтва краёвай гаспадаркай. Такім парадкам, напярэдадні ўстанаўленьня упраўленьня Лігі Народаў нам суджана йшчэ адна зьмена ўлады.

Як адбіваюцца на жыцьці краю гэткія частыя зьмены „гаспадароў", — гэта кожнаму зусім ясна. Ясна, што ў атмасфэры няпэўнасьці заўтрашняга дня зруйнаванае доўгай вайной і окупацыямі нашае экономічнае жыцьцё ня можа адбудавацца, ня можа наладзіцца нанова. Наш экономічна-гаспадарчы лад з кожным днём далей разваліваецца; фабрыкі стаяць бяз руху; гандаль чуць-чуць крапаецца, дый ён дайшоў да первабытнага стану беспасрэднай замены тавару на тавар—бяз учасьця грошы, страціўшых усялякую цану; таргаваць з заграніцай мы можам адно толькі праз Польшчу, якая, ведама, пускае да нас тое, што ей самэй непатрэбна,—а да багатай хлебам, коньмі, скацінай і ўсім-чым Літвы доступ зачынены з прычыны сваркі паміж ею і Польшчай.

Бяручы ўсё гэта на вум, само сабой узьнімаецца пытаньне: дзеля чаго-ж Польшча робіць у нас зьмену ўлады на зусім кароткі час?

Адну з прычын, пэўне-ж, становіць спадзяваны плебісцыт. Відаць, на пагляд варшаўскіх палітыкаў, урад так-званае „Сярэдняе Літвы" блага падгатовіў народныя масы да плебісцыту, не настроіў іх прыхільна да Польшчы. І варшаўскі ўрад, лічучы, што „стражнікі крэсовыя", і „адраджэнцы", і ўся чыста польская адміністрацыя і жандармэрыя „Сярэдняе Літвы" мала пастараліся, хоча цяпер сам узяць у рукі ўсю справу падгатоўкі плебісцыту. У гэтым кірунку варшаўскі сойм ужо прыгатаваў плян, які павінен узмацаваць у нас сілы прыхільнікаў Польшчы: плян гэты—ваенная колонізацыя нашага краю.

Чытальнікі нашы пэўне памятаюць прыняты варшаўскім соймам закон, паводле каторага ў дзевяцёх беларускіх паветах, адышоўшых ад Расеі пад Польшчу і пад Літву, польскі ўрад будзе надзяляць зямлёй польскіх жаўнераў. У тых паветах, якія знаходзяцца беспасрэдна пад польскім ўрадам, надзяленьне салдатаў зямлёй ужо пачалося. Але ў тых паветах, якія Польшча ўключыла ў „Сярэднюю Літву", варшаўскія законы ня мелі сілы, дык і дзяліць нашай зямлі паміж, польскіх салдатаў ня было як. — Вось, цяпер Польшча і пераймае ў свае рукі упраўленьне „Сярэдняй Літвой", каб прыступіць і тут да ваеннай колонізацыі і гэтак мець па ўсім краю пэўных людзей, якія і самі будуць галасаваць за Польшчу, і патрапяць зрабіць патрэбны „націск" на беларускае сялянства...

Мы, аднак, думаем, што гэты плян ня дасьць Польшчы спадзяванае карысьці. Справа зямлі—гэта для нас самая балючая справа, і мы наперад можам сказаць, што тутэйшыя сяляне — навет тыя спаміж іх, каторыя навучыліся гаварыць „po polskiemu" і лічаць сябе за „польскіх",—калі ўбачаць, як зямлю, каторую яны самі, іх дзяды і прадзеды сотні гадоў палівалі сваім крывавым потам, забіраюць чужынцы, дык адракуцца і сваей „польшчызны", і самае Польшчы, якая замест абяцанай ім волі і долі нясе ваенную колонізацыю! — Затое праўдзеньне ў жыцьцё гэтага пляну толькі узьвялічыць у нас нацыянальную барацьбу, ўвагнаўшы яе у глыб народу.

Апошняе яшчэ менш пажадана, чым самая ваенная колонізацыя, бо ня ў новай барацьбе, а ў спакойнай творчай працы бачым мы ратунак ад поўнай руіны нашага краю. Ратунак гэты—ў стварэньні такіх варункаў, пры каторых ніякая ўлада не магла-бы завімацца сваімі нацыяналістычнымі экспэрымэнтамі, пры каторых край наш атрымаў-бы поўную свабоду гандлю з заграніцай, свабоду прывозу і вывазу тавараў, магчымасьць забасьпечыць вёску к вясьне сельска-гаспадарскімі машынамі і струмэнтам, коньмі, скацінай, насеньнем. А гэта будзе магчыма тады, калі расчыняцца ўсе граніцы і дэмаркацыйныя лініі, калі пачнецца падвоз з Літвы і—праз Літву — з заграніцы.

Чым хутчэй гэта наступіць, тым лепей.

І. Мялешка.

Палітычныя пэрспэктывы.

Кожын раз, як у Расеі узьнімаецца хваля контррэвалюцыі, над гэтай старонкай „неабмяжованых магчымасьцей" лунае страшны прывід: гэта—прывід павароту царскае рэакцыі. Здарма людзі, якія на ўсё углядаюцца праз рожавыя акуляры і бачуць праз іх тое, чаго самі хочуць,—спадзяюцца, быццам на руінах камунізму запануе эс-эраўскі рай: падобна таму, як ка-дэцкая рэвалюцыя, паднятая ў марцы 1917 году, у восені таго-ж году адным махам пэрайшла да камуністычнага перавароту, — гэтак сама контррэвалюцыя можа супраць волі арганізатараў і кіраўнікоў перамахнуць управа ажно да манархіі.

Весткі, якія йдуць цяпер з Маскоўшчыны, прымушаюць усе бышыя „акраінныя" народы Расеі быць гатовымі да ўсяго: манархічная Расея (або хоць-бы і ка-дэцкая рэспубліка) будзе такой-жа імпэрыялістычнай і цэнтралістычнай, як была да вайны, — і той „усерасейскі труп", які і бальшавікі, і Эўропа ўжо пачалі зарываць у зямлю, паўстаць можа ізноў, каб паняволіць ізноў вызваленыя народы.

Што гэтага трэба баяцца, на гэта паказвае факт, што адначасна з весткамі аб контррэвалюцыі ў Расеі пачалі шырыцца чуткі аб падгатоўцы манархічнага перавароту ў Нямеччыне. Ясна, што чуткі гэныя йдуць не здарма: яны сьведчаць, што расейская і нямецкая рэакцыя толькі ждуць такой часіны, калі яны здолеюць кінуцца сабе ў абоймы, здратаваўшы капытамі сваіх каней тыя незалежныя старонкі, што залеглі паміж Маскоўскай і Нямецкай зямлёй.

Усё гэта мы павінны добра ўразумець і зрабіць належныя вывады. Скажам, што вывады гэтыя даўно ўжо зрабіў у Польшчы адзін чалавек: Пілсудскі. Ен, супраць волі ўсяго польскага грамадзянства, ня гледзячы на націск з боку Антанты, катэгорычна адмовіўся зрабіць саюз і даць помач Дэнікіну, калі той быў ужо чуць не за дзьвесьце вёрст ад Масквы! Бо Пілсудскі разумеў, што дэнікінская Расея першым дзелам працягне сваю цяжкую руку на заход—у кірунку Польшчы...

Але і Пілсудскі не зрабіў усіх вывадаў з таго, што паказвае нам паварот у Расеі старога ладу. Ясна, што ўсе новыя „акраінныя" дзяржавы толькі тады маглі бы пачуваць сябе спакойна, ня гледзячы на ўсе перамены ў Маскоўшчыне, калі-б яны—кожная з асобку — даволі акрэплі, ўзмацавалі свае сілы, а ўсе разам жылі-бы ў дружбе, бачучы адна ў аднэй прыяцеля і маючы поўную веру, што дужэйшы сусед ня будзе пагражаць слабейшаму тым, чым награжае ўсім нам разам рэакцыйная і імпэрыялістычная Расея. Тымчасам Польшча перашкодзіла беларусам стануць на ногі і стварыць сваю дзяржаўную арганізацыю і аружную сілу, павзала з Украінай і зьнішчыла яе армію, а пасьля, абязсіліўшы яе і выгаргаваўшы ад яе Галічыну, Валынь і Падольле, прызнала незалежнасьць Украінскай Народнай Рэспублікі напярэдадні заваяваньня яе Савецкай Расеяй. Урэшце, Польшча не здалела дайсьці згоды з Літвой, усьцяж пагражаючы яе незалежнаму існаваньню, а крок генарала Жэлігоўскага, аружнай сілай заняўшага Вільню, ў канец папсаваў польска-літоўскія адносіны. І вось, у мамэнт, калі выпадкі суляць пераварот у Расеі, калі расейскі і нямецкі імпэрыялізмы ізноў паднімаюць галаву,—ў гэты мамэнт паміж Польшчай і яе найбліжэйшамі суседзямі няма згоды!

Можна было-б падумаць, што за ўсю гэную няўдачлівую палітыку Польшчы павінны адказваць толькі польскія нацыяналісты і імпэрыялісты. Дык-жа не: за яе адказваюць і польскія соцыялісты—тыя, што на славах зьяўляюцца абаронцамі волі і брацтва ўсіх народаў, а дзеле—такія-ж імпэрыялісты, як і эндэкі. Так, калі паводле рыжскага міру Польшча і Расея падзялілі між сабой Беларускую зямлю, проці чаго беларусы востра запратэставалі, найстарэйшы кіраўнік Польскай Партыі Соцыялістаў (P. P. S.) Дашынскі з нязвычайным, неспадзяваным у вустах „соцыялісты" цынізмам адказаў: „Так, мы вас падзялілі, бо мелі сілу!"

На такім-жа становішчы стаяць і „таварышы" з „Польскай Партыі Соцыялістаў Беларусі і Літвы" (P. P. S. B. i L.). Калі войскі ген. Жэлігоўскага занялі Вільню, партыя гэта прыняла рэзалюцыю, ў каторай гаворыць аб пажаданьні фэдэрацыі ўсяе Літвы з Польшчай; калі-ж ліцьвіны на гэта ня пойдуць, дык і яна, як усе эндэкі і „крэсовцы", дамагаецца простага далучэньня да Польшчы тых зямель, якія заняты польскім войскам. А што гэтыя землі — беларускія, што і воля беларускага народу быць незалежным хіба мае вагу, — аб гэтым «краёвыя» польскія соцыялісты мала клапоцяцца..

Мала клапоцяцца аб усім, што ня носіць польскага кляйма. Гэта паказала і апошняя спроба беларускіх і літоўскіх соцыялістаў згаварыцца аб долі нашай зямлі з польскімі соцыялістамі — тут, у Вільні. Спроба гэта скончылася нічым, бо польскія соцыялісты ўсё яшчэ дзяржацца тае свае рэзалюцыі...

Гэта палітычная сьлепата польскага грамадзянства, гэты польскі нацыянальны максымалізм, каторы хоча заўладаць усімі суседнімі землямі, дзе ёсьць хаця трохі палякоў, можа ў недалёкай будучыні давясьці да катастрофы, ад якой роўна пацерпім і мы ўсе, і сама Польшча. Праўда, мо' па упадку савецкае ўлады ў Расеі. Польшча на мамэнт і заўладае тымі землямі, на якія галіцца. Але гэта магчыма толькі на мамэнт, бо з такім палажэньнэм не пагодзяцца ніколі ані паняволеныя Польшчай народы, ані тая расейская ўлада, якая пераймe упраўленьне пасьля бальшавікоў.

Час, вялікі час працьвярэзіцца і пазбыцца таго максымалізму, каторы лёгка можа вярнуць Польшчу да «разьбітага карыта»..

А. Л.

Статыстыка і палітыка.

У адказ на нашую стацьцю „Плебісцыт і беларусы" „Gazeta Wileńska" замесьціла ў № 46 артыкул пад назовам „Białorusini wobec plebiscytu". У якім стараецца крытыкаваць выказаныя намі думкі і прыведзеныя намі статыстычныя даныя. Але „G. W". ня ўказывае крыніцы, з якой мы ўзялі статыстычныя даныя аб нацыянальнасьцях, засяляю-

чых наш край, кажучы толькі, што „dowody swe p. „Wileńczuk" popiera danemi statystycznemi, z których" і г д.

Прачытаўшы гэты тэкст „G. W.", можна падумаць, што прыведзеная намі статыстыка ўзята Бог ведае адкуль, а можа і проста высcана з пальца. Чаму-ж „G. W." ухілілася назваць крыніцу нашай статыстыкі? Яна-ж намі была названа. Гэта праца польскіх прафэсараў польскага Кракаўскага унівэрсытэту: „Tableau Statistique de la Pologne", надрукаваная ў Кракаве у 1915 годзе, страніцы 50—53. Відаць паны з „Gazety Wilenskiej", баяцца аб тым гаварыць, бо гэтая польская статыстыка забівае іх на сьмерць, бо яна польская і сьведчыць проціў польскіх пратэнсіяў. Калі для газэт была у Вільні папярэдняя цэнзура, нядаўна скасаваная, то чырвоны аловак гэтай цэнзуры некалі разоў вычырківаў надрукованыя намі цяпер, без цэнзуры, даныя.

Ай да польскія прафэсары! Як яны нашкодзілі эндэцкай палітыцы свайй статыстыкай!

За тое, паном з «Gazety Wilenskiej» вельмі падабаецца статыстыка „Генаральнага Камісарыяту Усходніх Зямель". Вось гэта так статыстыка! Як у свой час адзначалася, статыстыка гэная дала такія дзіўныя рэзультаты: аказалася, што на „Крэсах Усходніх" больш палякоў, ніж каталікоў. Значыцца, усе каталікі, навет тыя, каторыя лічуць сябе беларусамі, аказаліся па гэнай статыстыцы палякамі, а таксама і жыды, мусіць, і праваслаўныя беларусы запісаны палякамі. Гэта ўжо ня тое што „Tableau" Кржыжаноўскага і Куманецкага, нейкіх там прафэсарышкаў з Кракава. Гэта—генаральная статыстыка, падмацаваная страж-крэсовай мукой і салам з Пазнані.

Пасьля „расправы" з „нашай" статыстыкай „Gazecie Wilenskiej" нічога, здаецца, не аставалася, як паставіць пункт або крыж, бо ціж варта з некімі беларусамі, каторых наагул няма, пачынаць дыскусіі; ажно—не. „G. W." стараецца даказаць, што „ёсьць групы, карыстаючыяся адным і тым самым языком, аднак пачуваючыя сябе рознымі адзінкамі (Англія і Злучаныя Гаспадарствы Амэрыкі), або, наадварот, размаўляючыя на розных мовах, але пасядаючыя супольнае народнае пачуцьце. Іншымі словамі—гэта нічога, што тутэйшы народ гаворыць пабеларуску, абы ён меў супольнае з палякамі пачуцьцё. І „G. W." праконана, што яно так і ёсьць, бо аб гэтым даводзіць інспіраваныя „Крэсовай стражай" пэтыцыі „сыноў зямлі" аб далучэньні да Польшчч.

На гэта мы адкажам „G. W" так. Калі-б у любой старане, хоць бы і у самай Польшчы, сталася такое палажэньне, як у Беларусі, што у аднэй частцы яе запанавалі-б бальшавікі, а у другой, скажам, немцы абы ангельцы, то мусіць што і пэўныя клясы палякоў сталі-б крычэць аб далучэньні да немцаў, хоць палякі і ня любяць немцаў, або да каго-б ні-было, або толькі не пайсьці пад бальшавікоў. Гэта раз. А другое—што ўсім добра ведама — гэта штучная у нашым краі палітыка апошняга часу, дзякуючы каторай ніводна народнасьць, апрача польскай, палітычна ня можа працаваць. Вольнасьць у тутэйшай палітыцы маюць толькі „далучэнцы".

Калі-б аднак, так здарылася, што ўлада у нашым краі перайшла ў рукі ўсіх краёвых нацыянальнасьцяў, то паны з «G. W.» скора-б убачылі, што „kierunek należenia do państwowości polskiej", бяз штучнага яго падтрыманьня, хутка-б завянуў, а потым і згінуў бы зусім, бо ніякай палітыкай (тым балей „страж-крэсоўскай") ня можна пераробіць статыстыкі, справядліва састаўленай.

В.

Не загіне!

Не загаснуць зоркі у небе,
Покі неба будзе;
Не загіне „Край забраны",
Покі будуць людзі.

Янка Купала.

Чужацкія коні капытамі сваім топчуць нашу Зямліцу... Крывавыя разоры парэзалі на кускі нашу Бацькаўшчыну... Чужынец адбірае ў беларуса яго зямлю, хлеб, школу, мову і самае імя...

Вось сумны абраз Беларусі.

Там — далёка — ў сталіцах сьвету судзяць і радзяць аб нас вялікія і дужыя дзяржавы. Яны змаўляюцца паміж сабой коштам слабейшых народаў — народаў, каторым ліхая доля не дала магчымасьці стварыць сваю дзяржаву і вялікую армію. Яны вераць толькі ў моц зялезнага кулака і манядца абаперці сусьветны мір і спакой на паняволеньні гэтых слабейшых народаў дужэйшымі. Кожнаму з сваіх сябраў кідаюць яны па костачцы: „Грызі яе і не прашкаджай другім рабіць тое-ж самае!" Гэта называецца: вызначаюць сфэры ўплываў... Нічога, што пры гэтым рвуць на кускі жывое цела падняволеных народаў: раз ты ня маеш сілы абараніцца, значыць, твой лёс—згінуць.

Так думаюць вялікія эўропэйскія дыплёматы ў Парыжу, ў Лёндане. Такія прыгаворы выносяць яны народам, якія ў гэты мамэнт ня могуць паказаць ім сваіх зубоў. Але ня гэтак робіцца ў жыцьці.

Каля паўтараста гадоў таму назад манархі расейскі, прускі і аўстрыйскі гэтак сама падзялілі Польшчу, лічачы, што яна няздольна да жыцьця. Але Польшча на нашых вачох уваскрэсла, а затое другая хаўрузія дзяржаўных волатаў падзяліла Аўстрыю, Расею і Нямеччыну.

Дзялілі і Турэччыну, якую празвалі „хворым чалавекам". Аднак-жа гэты „хворы чалавек", цярпеўшы „апеку" чужынцаў толькі да часу, ўрэшце схамянуўся і вось на нашых вачах вядзе аружную барацьбу з насільнікамі.

Соткі гадоў зьдзекавалася Англія над Ірляндыяй, над Індыяй. І вось прад намі разьвіваецца магутнае змаганьне народаў за іх волю—за поўную дзяржаўную незалежнасьць. І няма такой сілы, каторая здалела-бы задушыць тыя народы.

Тое ж будзе і з народам беларускім. Мо' лішне позна збудзіўся наш народ зо-сну, ў якім правёў цэлыя сталецьці. Мо' лішне рана прад ім жыцьцё наставіла цяжкую задачу: будаваць сваю дзяржаву. Але народ наш ужо ня сьпіць, ужо выявіў сваю волю быць гаспадаром на роднай Зямлі, лішне многа ахвяр палажыў на аўтар Незалежнасьці, каб яго можна было закаваць нанова ў путы рабства і зьніштожыць.

Нішто так не узмапоўвае ідэі, як пралітая за яе кроў. Гэтай крыві пралілі беларусы даволі: лілі яе паўстанцы, лілі сяляне ў барацьбе з рознымі окупантамі.

Гэта кроў нашых герояў напаіла і здабрыла нашу Зямліцу і, узьнімаючыся з яе празрыстаю параю, пранікае ў сэрцы і душы людзей і ня дасьць ім ужо ніколі заснуць. Ніякі ўціск, ніякія гвалты не затушаць ужо сьвядомасьці нашага народу. Замест аднаго байца за волю паўстаюць два, тры, дзесяць новых, і па ўсей зямлі йдзе глухі покліч: „да дзела—да працы".

Мы памятаем часы масхоўскага самадзяржаўства. Мы памятаем, што навет імя нашае Бацькаўшчыны стараліся вычыркнуць са сьпісу жывых народаў. Была не Беларусь, а „Сѣверо-Западный Край". Сорак гадоў нельга было надрукаваць ніводнае легальнае кніжкі ў беларускай мове. І ўсё-ж мы ўваскрэсьлі: ўваскрэсьлі, бо народ наш жыве, бо ён толькі спаў. Але, калі сьпячага вораг не перамог, ды ж не пераможа і прачнуўшагася.

Усё-ж, трэба прызнацца, што мы перажываем ліхую часіну. Хоць сілы нашы узрасьлі, дык жа ўзрасьлі і сілы ворагаў. Вось чаму цяпер асабліва цэнны для нас кожны баец, кожны беларускі працаўнік. Нам трэба прабіваць той варожы мур, якім стараюцца закрыць беларускую справу заграніцай. А разам з тым трэба распаліваць яе дома, каб грозным полымем лунала аж да неба, каб увесь сьвет бачыў яго.

Вось, мы і заклікаем нашых братоў і дома, і заграніцай, каб у гэты грозны для нас мамэнт аб'ядналі сваe распыленыя сілы дзеля дружнай, згоднай працы.

Бо запраўды вешчыя словы сказаў наш вялікі нацыянальны пясьняр:

„Не загіне „Край Забраны",
„Покі будуць людзі!"

Т. Б.

Яшчэ аб „Бацьку".

(Голас слуцкага паўстанца).

Шмат ужо гаварылася і пісалася аб учынках Булак-Балаховіча, але ў зьвязку з стацьцёю „Абвінавачываю" у № 7 „Н. Д." мне ўспомніўся адзін эпізод з нядаўна ліквідаданага Слуцкага паўстаньня. Паўстанцы Случчыны, кіраваныя Радаю Случчыны і зарганізаваўшыся ў першую Брыгаду войск Беларускае Народнае Рэспублікі, заўсёды няпрыхільна адносіліся да Балаховіча. Шмат яго агентаў перабывала на фронце ў паўстанцаў і, карыстаючыся тым, што ў іх ня было ні вайсковых прыладаў, ні харчоў, намаўлялі далучыцца да Балаховіча, дакляруючы тады даць усё патрэбнае. Але галодныя й голыя паўстанцы катэгарычна адмовіліся прызнаць Балаховіча сваім важаком. Саўсім зразумела, што такія адносіны не магчі зда-

Праца Беларускага Нацыянальнага Камітэту у Вільні за 1920 год.

У першай палове 1920 году, у гэты самы цяжкі час панаваньня ў нашым краі польскай эндэцыі, аб якім так красамоўна расказаў у сваей кніжцы „Польская акупацыя на Беларусі" п. Антон Луцкевіч, — дзеяльнасьць Віленскага Нацыянальнага Камітэту сайшла да вынясеньня рэзалюцый пратэста проціў якога-кольвек гвалтоўнага ўчынку над беларусамі, абароны беларускага грамадзянства ад зьдзеку і дробнай працы, напрыклад, вызваленьня з-пад арэшту беларускіх сялян, работнікаў, нацыянальных працаўнікоў і г. д. Палітычная і творчая нацыянальная праца Камітэтам, як установай, не рабілася. Калі чынілася штонебудзь у гэтых кірунках, то толькі асобнымі сябрамі Камітэту на сваю рызыку і страх і па інструкціях тае палітычнае партыі, да якой той ці другі сябра камітэту належаў. Трэба адзначыць, што акрамя акупацыйнага ўціску, тормазам працы ў Камітэце, былі яшчэ і другія прычыны, маючыя вялікую вагу ў беларускім руху, але аб іх цяпер пакуль што рана гаварыць.

Затое з заняцьцем Вільні Ліцьвінамі праца Нацыянальнага Камітэта буйна зацьвіла.

Яшчэ ў Вільні—бальшавікі, а Нац. Кам. ужо зьбіраецца і вядзе гарачыя дэбаты, выбірае камісіі і распачынае працу. Камітэт зложаны у той час з 24 асоб, разьбіваецца вось на якія камісіі: арганізацыйную, школьную, клюбовую, юрыдычную і палітычную. Эвакуацыя Вільні палякамі выкінула на вуліцу цэлыя масы безработных. На аднэй чугунцы аказываецца да 2500 працаўнікоў розных прафэсыяў беларускай нацыянальнасьці бяз куска хлеба. Соткі безработных астаюцца на пошце і ў другіх урадовых установаў. Нац. Камітэт зносіцца з прадстаўнікамі Літоўскага ўраду аб прынятку іх на службу, але здаволіць просьбу гэту ён ня можа з тае прычыны, што польская ўлада пры авакуацыі вывезла ставкі розных дзяржаўных майстэрняў, як напрыклад зялезнадарожных, артылерыйскіх і г. д. Арганізацыйная камісія робіць рэгістрацыі безработных, склікаець іх сход. На сходзе абгаварываецца палажэньне і выносіцца пастанова, у якой выказываюцца думкі аб тых мерапрыняцьцях, якія ўрад можа ў гэты мамэнт правесьці ў жыцьцё і гэтым палегчыць крызіс безрабоцьця. Школьная камісія (потым школьная рада) распачынае працу па адкрыцьцю школ як у Вільні, так і на правінцыі. Клюбовая камісія прымае крокі к адкрыцьцю клюба, ў якім беларускія працаўнікі маглі-бы спатыкацца ў гадзіны адпачынку і згаварыцца аб далейшай працы. Юрыдычная адкрывае рэгістрацыю юрыстаў дзеля стварэньня свайго гуртка. Палітычная камісія, у склад якой увайшлі прадстаўнікі розных палітычных партый, вырашае варункі супольнай працы з ліцьвінамі і на іх аснове апрацовывае меморыял да Літоўскага ўраду. Гэтыя варункі уложаны ў рэзалюціі, прынятай пленумам Нац. Кам. ў пачатку верасьня месяца; зьмест іх вось які: „Разгледзяўшы палажэньне, утворанае ў зьвязку з літоўска-расейскай міравой умовай, і выслухаўшы справаздачу прадстаўнікоў беларускага грамадзянства, езьдзіўшых у дэлегаціі да Літоўскага ўраду, — сход прадстаўнікоў Цэнтральнае Беларускае Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны, Беларускага Нацыянальнага Камітэту і ўсіх другіх беларускіх арганізацыяў, уважаючы, што ўсе тэрыторыяльныя спорнкі між Беларусьсю і Літвой павінны быць аканчальна разьвязаны дарогай міжнародных зносін Беларускага і Літоўскага урадаў, і прымаючы пад увагу вымогі жыцьця, прызывае ўсіх беларусаў, жыхароў прылучанай да Літвы беларускай тэрыторыі, каб злучылі ўсе свае сілы дзеля згоднае, супольнае з братнім літоўскім народам дзяржаўнае працы і дзеля здабыцьця беларускаму народу належнага яму месца на роднай зямлі.

Адначасна з гэтым, сход прадстаўнікоў вышэйсказаных арганізацыяў зварочываецца да Устаноўчага Сойму Літвы, у якім беларусы яшчэ ня маюць сваіх прадстаўнікоў, а такжа да Літоўскага ўраду, з цьвёрдым дамаганьнем забасьпячэньня тых варункаў, пры каторых беларусы маглі-бы прыняць актыўнае ўчасьце у дзяржаўным будаўніцтве супольнае бацькаўшчыны і здаволіваць усе свае нацыянальныя патрэбы.

У змысл гэтага сход жадае.

1) Каб аснаўнымі законамі Літвы была выдзелена ў асобную аўтаномную адзінку далучаная да Літвы беларуская тэрыторыя у межах перавагі беларусаў. 2) Каб для гэтае тэрыторыі ўжо цяпер быў утвораны часовы орган (краёвая рада), зложаны з прадстаўнікоў арганізаванага грамадзянства ўсіх нацыянальнасцяў гэтае часьці Літвы, каторы супольна з намесьнікам Літоўскага ўраду наладзіў-бы краёвую адміністрацію і суды, арганізаваў-бы усё жыцьцё і падгатаваў-бы і правёў-бы выбары, як ў органы лёкальнага і краёвага самаупраўленьня, так і ў агульна дзяржаўныя ўстановы. 3) Каб задакляраванае Літоўскім ўрадам права ўсіх нацыянальнасцяў Літвы на пэрсанальную аўтаномію было праведзена ў поўнай меры ў адносінах да беларусаў там, дзе яны становяць меншасць, і каб на чале міністэрства беларускіх спраў быў пастаўлены чалавек, маючый даверые беларускага грамадзянства".

Дзеля працы ў магістраце Нац. Кам. дэлегуе свайго прадстаўніка, які там становіцца на чале апрывізацыйнага і дабрачыннага аддзелаў, ад пары да пары інфармуе Нац. Кам. аб сваёй працы. Таксама Камітэт выбірае свайго прадстаўніка на школьнага інспэктара і прапануе яго Літоўскаму ўраду. Рэкамэндуе сваіх кандыдатаў наагул у розныя ўрадовыя ўстановы. На жаль, фігура міністра Беларускіх спраў пры Літоўскім ўрадзе п. Сямашкі тармазіць энэргічную працу Нац. Кам. і псуе адносіны астатняго да спамянутага ўраду. У той час, калі работа другіх нацыянальнасьцяў, як яўрэяў і палякоў, распачалася прадстаўнікамі пры Літоўскім ўрадзе гэтых нацыянальнасьцяў зараз-жа па заняцьці Вільні ліцьвінамі, міністар па беларускіх справах сядзеў у Коўні і нічагусенькі не рабіў. Гэта страшэнна тармазіла працу Камітэту. Калі п. Сямашка пераехаў у Вільню, былі прыняты крокі, каб ён зьявіўся ў Камітэт дзеля абгаварэньня варункаў супольнае працы. Урэшце, на сходзе Камітэту 18 верасьня, на якім быў і даваў справаздачу міністр п. Сямашка, выясьнілася, што ён не падгатаваны да занятага ім адпаведнага становішча і наагул нездольны да тэй працы, якая яго чакае на міністэрскай пасадзе. Камітэт выслухаўшы справаздачу міністра, востра яго крытыкуе і ў канцы выносіць рэзалюцыю недаверыя міністру, якую перадае Літоўскаму ураду, Старшыне Устаноўчага Сойму і рассылае ўсім палітычным фракціям гэтага Сойму. Невядома, як адклікнуўся-бы Літоўскі ўрад на гэту рэзалюцыю Нац. Кам., а таксама—як пашла-бы праца Нац. Кам. тады, калі у Вільню перабраўся-бы Літоўскі Устаноўчы Сойм і наагул увесь урад. Работа Камітэту з Літоўскім ўрадам раптоўна спынілася з заняцьцем Вільні войскам генарала Жэлігоўскага, якое адбылося у 10 чыслах кастрычніка. Усежтакі трэба адзначыць, што палітычныя крокі Камітэту мелі свае рэзультаты. Мэморыялы яго зварухнулі літоўскую палітычную думку і пэўна, што дапамаглі ўраду Ластоўскага згаварацца і заключыць вядомую беларуска-літоўскую умову, рэзультатам якой зьявіўся пэўны кантакт гэтых урадаў у міжнароднай палітыцы і поўныя братняга даверыя

воліць ганэровага „Бацьку“, які дамагаўся захапіць дыктатарскую ўладу на Беларусі. І вось ён, лічачы, што вінок не пажаданага для яго настрою паўстанцаў зьяўляецца крамольная Рада Случчыны, камандырує да іх нейкага капітана С., якому дае загад зрабіць з паўстанцаў Слуцкі полк яго імя. Зьявіўшыся на фронт, капітан С., чалавек, паміж іншым, вельмі недалёкі, патрэбаваў, каб Рада адмовілася ад усякага ўмяшательства ў вайсковыя справы, пагражаючы ў праціўным выпадку растраляць усю Раду. Сябром Рады капітан С. адкрыта сказаў, што ён мае паўнамоцтвы ад генарала Балаховіча пакончыць з Радаю, якая па думцы генарала была настроена па-левэ-эсэраўску. Аднак, не знайшоўшы падтрыманьня ня толькі сярод паўстанцаў, але навет і сярод афіцэрства, капітан С. павінен быў адмовіцца ад выпаўненьня дадзенага яму „згары“ загаду. Хоць паўстанцы і шмат чаго чулі ў той час аб Балаховічу, але ім ня верылася, што ён можа дайсьці да падобнае рэчы, і многія з іх думалі, што капітан С. робіць у гэтым выпадку сам па сабе. Цяпер-жа, пасьля таго, як зьявіўся ў друку пералік зробленых Балаховічам „подвігаў“, можна не сумлівацца, што паказаны загад аб растрэлу Рады запраўды быў дадзены ад самога „Бацькі“. Гэты эпізод даволі ясна абмалёўвае адносіны „генарала-дэмакрата“ да народнага прадстаўніцтва, каторым у даным выпадку зьўлялася Рада Случчыны, выбраная беларускімі сялянамі, якія даручылі ёй падняць сьцяг аружнага змаганьня за незалежнасьць Бацькаўшчыны.

Мы, паўстанцы, яшчэ раз падымаем свой голас і кажам: „Генарал Балаховіч! Мы Вас ня прызнаём сваім важаком!“

Алек.

Аб беларускіх пісьменьніках.

За астатнія гады беларуская літэратура мае нязвычайна цяжкія, без канца балючыя страты ад сьмерці такіх выдатных поэтаў, пісьменьнікаў і літэратурных дзеячаў, як Лявон Гмырак († 1915 г.), Алёізія Цётка-Пашкевічанка († 1916 г.), Максім Багдановіч († 1917 г.), Карусь Каганец († 1918 г.), А. Петрашкевіч († 1918 г.), Іван Луцкевіч († 1919 г.), Фабіян Шантыр († 1920 г.), Алесь Гарун († 1920 г.) і інш.

З ліку раскінутых вайною і рэвалюцыяй ува ўсе куты сьвету беларускіх працаўнікоў, шмат якія дагэтуль яшчэ не падалі свайму грамадзянству знакаў жыцьця.

Невядома, жывы ці не і дзе знаходзяцца такія, прыкладам, літэратурныя сілы, як пісьменьнік старой, несьвядомай Беларусі А. Р. Ішчолка, мужыцкі ідэолёг Восіп Арлоўскі, пісьменьнік-этнограф А. Р. Раманаў, з нашаніўцаў: М. Арол, А. Гурло, Янук Журба, Андрэй Зязюля, Кандрат Лейка, Лявон Лобік, Новіч (доктар Ціхановіч), Фёдар Чарнышэвіч, Янук Д. і інш.

Аб другіх поэтах і пісьменьніках даходзяць весткі, што яны жывы, але ня маюць магчымасьці вярнуцца на Беларусь і гаруюць на чужыне.

Летась улетку наказывалі з Менску, што Якуб Колас жыве ў м. Абаяні Курскае губэрні. Ён ірвецца дамоў усімі сіламі, але маючы сям'ю, страціўшы здароўе і галадуючы на жабрачую пэнсію пачатковага вучыцеля, ніяк ня можа выехаць з глухога кутка Савецкае Расеі, куды закінула яго ліхая доля. Хочацца мець надзею, што за доўгі час разлукі з нашай літэратурнай грамадою ён папісаў шмат твораў з усім размахам сьпелага поэтычнага таленту, але ня йменца веры, каб паказаная абстаноўка спрыяла яго творчасьці, асабліва праз немагчымасьць друкавацца і духоўнае адзіноцтва. Беларускае грамадзянства і Урад павінны дalaжыць усіх стараньняў, каб ўратаваць поэта ад яго цяжкога моральна і матар'яльна становішча.

Канстанцыя Буйло зайшла замуж за В. Калечыца і па даўных вестках жыла на ст. Шахаўской Аляксандраўскае чыгункі пад Масквою. Шкада, калі новыя абавязкі не дазваляюць ёй паранейшаму жыць літэратурнай творчасьцю і справай вызваленьня бацькаўшчыны.

У Менску ня жывуць, а цьмеюць ня ўзысканыя міласьцю ўсемагучых, але чужых дзеля беларускага слова камуністаў-прыблудаў, гэткія беларускія таленты: поэт Янка Купала, новэліст Зьмітрок Бядуля, драматургі Ф. Аляхновіч і Баладзіслаў Галубок, белетрыст і публіцыста Язэп Лёсік, а таксама слабенькі беларускі камуніста і добры, моцны поэта Цішка Гартны (рэдактар „Савецкае Беларусі“). Там-жа павінен быць поэт-гумарыста А. Паўловіч, а з маладзейшых А. Галіна (брат Я. Коласа), т. Кудзелька, Бруевіч і інш.

Гдзе Ядвігін Ш.—невядома.

У Вільні цяпер знаходзіцца А. Навіна і іншыя літэратары, іменьні якіх ёсьць у „Нашай Думцы“ і „Крыніцы“. Апроч таго, тут-жа цяпер ёсьць моцныя сілы расейскіх пісьменьнікаў-публіцыстаў, родам беларусаў, як Д. Бохан, В. Самойла. Жывуць у Вільні або у ёй бываюць, толькі нічога цяпер ня друкуюць у тутэйшай прэсе, А. Уласаў, Вацюк Тройца, Ф. Умястоўскі і інш.

У Вільні-ж «на Лукішках» (вастрог) мадзее аўтор музыкальнае літэратуры Антон Грыневіч, як кажуць, за пераход польска-бальшавіцкага фронту без належных дакумэнтаў.

Прыбіўся ўрэшце ў Горадню малады і здольны, але слабы здароўем і энэргіяй Я. Фарботка.

Гдзесь у Лодзі гіне Краўцоў Макар, а ў Варшаве, здаецца, Гальяш Леўчык, Рамуальд Зямкевіч.

Вацлаў Ластоўскі і Піліпаў—у Коўні. Першаму цяпер замінае пісаць яго нязвычайнай важнасьці палітычна-грамадзкая праца, хаця ўсё-ж ён мае колькі нядрукаваных поэтычных твораў, а другі лішне мала цэніць свае здольнасьці ці можа дзеля другіх прычын забыўся на тое, што ён—поэт і пісьменьнік.

Л. Родзевіч жыве гдзесь у глушы Вялейшчыны і, здаецца, патроху піша. Стары Улас прыяжджаў у Вільню з Сужан, дзе ён цяпер лясьнікам, і прывёз у друк шмат вершаў.

К. Сваяк жаве ў Засьвір'і Сьвянцянскага павету.

Натальля Арсеньнева, маладая і, як бачым з вершаў у „Нашай Думцы“, надта спадзейная пясьнярка, канчае ў гэтым годзе 1-ю Віл. Бел. Гімназію.

Урэшце—дужа прыемная навінка: Б. Тарашкевіч знайшоў рукапісныя творы біз часу загінуўшага Адама Гурыновіча (Гл. стр. 101 „Гіст. Бел. Літ.“ М. Гарэцкага) і навет прыпісуець яму „Панскае ігрышча“.

А. Мсьціслаўскі.

адносіны паміж беларускім і літоўскім грамадзянствам. Праз некалькі дзён пасьля заняцьця Вільні генаралам Жэлігоўскім камітэт зьбіраецца для высьненьня сваей пазыцыі да ўраду так званае Сярэдняе Літвы. Азнаёміўшыся з дакладам палітычнае камісіі, Камітэт знаходзіць, што няма пакуль што патрэбы перагледаць старое палітычнае становішча Камітэту і, выслухаўшы даклады сяброў яго аб рабунках на вёсках, дэлегуе да новага ўраду сваіх прадстаўнікоў з заявай. Дзеля таго, што рабункі спынены ня былі, Нац. Кам. падаець генаралу Жэлігоўскаму у гэтай справе належны мэморыял. На абвешчаную ўрадам Сярэдняй Літвы мабілізацію Нац. Кам. рэагуе сваім мэморыялам да генарала Жэлігоўскага, у якім паказуе на няпраўнасьць мабілізацыі беларусаў.


На плебісцытнае пытаньне ў Віленшчыне Камітэт адклікаецца падачаю некалькіх мэмарыялаў у Лігу Народаў праз прадстаўнікаў гэтай Лігі. У гэтых мэмарыялах камітэт указываў, што калі плебісцыт адбудзецца, та ён павінен захапіць усю беларускую тэрыторыю, уступленную бальшавікамі, і пры вырашэньні волі народа трэба паставіць яму ня два пытаньні („за Польшу“ ці за „Літву“), а тры: За Польшу, за Літву і за Беларусь, або з аднаго боку за Польшу, а з другога за Літву і Беларусь.

Калі урадам Сярэдняй Літвы быў выданы дэкрет аб скліканьні ў Вільні Сойма, то Камітэт, разгледзіўшы гэтае пытаньне, вынес рэзалюцію аб адмове ад прыняцьця ўчасьця ў выбарах у гэты Сойм. Дзеля таго, што у той час гэта рэзалюцыя камітэта ня была надрукована ў газэтах, і некаторыя кірункі польскай палітычнай думкі да гэтых пор ня могуць зразумець прычыны адмовы беларусаў ад выбараў, лічу патрэбным прывясці тут рэзалюцыю цалком: „Прымаючы пад увагу 1) што выбары у Віленскі Сойм, расьпісаныя урадам так званай „Сярэдняй Літвы“, маюць адбыцца на маленечкай, штучна і тэндэнцыйна выразанай частцы Беларускае зямлі, не абнімаючай навет усяе „Сярэдняе Літвы“ і ня маючай ніякага права гаварыць за ўвесь гэты край; 2) што вялізарная часьць насяленьня гэтага абшару, выгнаная з краю вайною, дагэтуль да дому вярнуцца не магла; 3) што права голасу дадзена войску, прыведзенаму генаралам Жэлігоўскім у наш край і арганізаванаму чужой нам польскай дзяржавай дзеля правядзеньня ў жыцьцё яе палітычных мэтаў: 4) што выбары будуць адбывацца у зусім ненармальных палітычных варунках, пры каторых стрррорызованае (гл. прыказ ген. Жэлігоўскага і інш.) насяленьне пазбаўлена свабоды слова і агітацыі ваеннай цэнзурай, Беларускі Нац. Кам. уважае, што абабраны пры такіх варунках Сойм ні ў якім прыпадку ня мае права прамаўляць ад імя краю. Дзеля гэтага Беларускі Нацыянальны Камітэт адмаўляецца ад усялякага ўчасьця ў сказаных выбарах“.

Такая пазыцыя да выбараў у Сойм нашага Камітэту, а таксама адмова ад учасьця ў выбарах яўрэяў і ліцьвіноў мела пажада'ны для ўсіх спамянутых нацыяў рэзультат. Сойм не сабраўся, і пытаньне аб долі Віленшчыны да гэтых пор вісіць у паветры.

Заканчываючы на гэтым кароткі абгляд працы Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту за леташні год, мушу адзначыць, што ня гледзячы на ўсьцяж зьменныя палітычныя варункі, ніводзін з палітычных крокаў яго не аказаўся абмылковым. Камітэт заўсёды дзяржаў высака штандар вызваленьня Беларускага народу, і йшоў толькі тою дарогаю, якою ён павінен быў іці дзеля адраджэньня сваей Бацькаўшчыны.

А. Карабач.



Пуцяводныя ідзі беларускае літэратуры.*)

Але не даволі любіць і тварыць абразы свайго нацыянальнага жыцьця і яго праяваў: шчыры артыста-мастак ня ведае, што такое вузкі нацыяналізм, — для яго нацыянальнасьць становіць адну з праяваў чалавечнасьці. Вось беларуская адраджэнская літэратура, уся абвеяная нязвычайна сільным умілаваньнем сваей бацькаўшчыны і свайго народу (напр., у Алеся Гаруна і др.) аказваецца зусім вольнай ад усялякага сьледу нацыянальнага шовінізму, нацыянальнай ненавісьці (чым грашылі часамі нашы прадвесьнікі адраджэньня з сярэдзіны XIX ст.!) Вольнай навет тады, калі Каганец гаворыць аб нашай загубленай старой волі, калі Купала вылічае праступкі „чужых людзей“ і грозіць ім народным судом, калі „Цётка“ жаліцца „суседзям у няволі“ на страшэнны ўціск маскоўскі, які беларусы цярпелі пад расейскай уладай.

Лёгка зразумець, чаму беларуская літэратура вольна ад нацыяналізму: яна-ж творыцца сынамі бадай самага найдэмакратычнейшага з адраджаючыхся народаў. Ідэал вызваленьня беларускага народу цесна лучыцца з агульна-людзкім ідэалам вызваленьня працы спад улады капіталу. Гэты соцыяльны элемент і гадуе разьвіцьце нацыяналізму як у беларускіх масах, так і ў іх прарокаў. Не здарма ў „гымне“ Купалы падняўшыяся народныя масы, нясучы „на сьвет цэлы — сваю крыўду“, гавораць аб адным жаданьні: «людзьмі звацца». „Нацыянальнае“ ў беларускай літэратуры зьліваецца з агульна-чалавечым, знаходзіцца ў поўнай гармоніі з ім.

Сілу, моц сваю беларусы чарпаюць толькі ў сваей працы. Яны сваімі рукамі будуюць сваю Бацькаўшчыну. Працай сваей яны кормяць увесь сьвет і самых сябе (гл. Купала). Апотэоза працы ўва ўсіх яе відах—гэта агульная рыса ўсіх беларускіх адраджэнцаў, ці то песьняроў вёскі (Колас, Купала, Алесь Гарун і інш.), ці то ідэолёгаў пролетарыяту (Цішка Гартны). Няма, бадай, ніводнага поэта, каторы ня зваў-бы свой народ да працы—ці то дзеля хлеба буднага, ці то для агульнае справы. Абраз такой жывой, ахвярнай працы для свайго народу, працы да апошніх сіл, да апошняга дыханьня, як антытэзу „сьлямазарнасьці“, бязьдзейнасьці, кволасьці, дае Максім Гарэцкі („Дзьве душы“). Але праца немагчыма бяз веры ў сябе, ў свае сілы, ў пабеду ідэі. І нашы песьняры будзяць ў нас гэту веру:

Гэй, наперад, покі сэрца
б'ецца, рвецца на прастор!
Годзе млеці ў паняверцы:
гэй, да сонца! гэй, да зор!
Хай бацькі стагналі ўчора,
йшлі на той сьвет без пары:
сёньня ў нашай моцы гора,
мы—жыцьця гаспадары!

Так піша Купала. І ў тон яму Якуб Колас („Што вы, хлопцы, спахмурнелі?!“) кліча да працы, бо толькі ў ёй ратунак ад мук, ад сьлёз, ад зьнямогі і роспачы:

За работу жыва, жыва!
Каб нас доля ня кідала,
каб ня сохла няша ніва,
каб нуда нас не чапала!

Творчай працай сваёй заваюем мы сабе і волю, і долю, і шчасьце. Гэтай дарогай вядуць нас нашы ідэйныя павадыры, нашы нацыянальныя прарокі. Гэтым яны і дапаўняюць ідэалы, аб каторых першы прамаўляў Багушэвіч і каторыя яны паглыбляюць у меру прабуджэньня народных мас.

Але жыцьцё і патрэбы культурнага беларуса вымагаюць такжа пашырэньня іх. Наша найнавейшая літэратура і выпаўняе гэту задачу: яна дае патрэбную кожнаму інтэлігенту духоўную страву і ад спраў зямных ірвецца ў вышу — да шырокіх кругазораў адарванай мысьлі і красы, да містыцызму (М. Гарэцкі, Бядуля). У нацыянальным яна знаходзіць агульна-людзкі элемент і прымушае нас любавацца чыстай красой парываў чалавечае душы („Мадонны“ Багдановіча, „Малітва малога Габрусіка“ Бядулі, красой прыроды (ўсе бяз выключэньня), красой формы і слова (найвялікшы стыліст—Купала, найвышэйшы мастак формы і абразовасьці—Максім Багдановіч).

Вось тут мы даходзім да таго, што беларускую літэратуру зьвязвае з сусьветнай літэратурай: нацыянальнае вырасла ў ёй у агульна-людзкае, зраднілася з усей людзкой сям'ёю, мае вартасьць ня толькі для беларуса, але для кожнага чалавека. А ў гэтым кірунку, бадай, найбольш заслужыўся „пясьняр чыстае красы“ Максім Багдановіч.

Гэтак разьвівалася і расла, такімі пуцяводнымі ідэямі кіравалася беларуская адраджэнская літэратура. Пачаўшыся несьвядома, яна усьведамляецца ў меру свайго разьвіцьця, творыць перш вузкія, становыя, а пасьля шырокія грамадзкія і нацыянальныя ідэалы і ўрэшце гэтак іх пашырае і паглыбляе, што становіцца часткай сусьветнага творства. І вось незалежна ад прызнаньня ці няпрызнаньня „вялікімі і можнымі“ гэтага сьвету права беларускага народу на жыцьцё,—ён, наш народ, сваей творчай працай заваёвывае сабе належнае месца у сям'і культурных народаў, і гэтага месца ніхто і нішто ў яго адабраць не здалее!

Ант. Навіна.

Вільня, 28. XII. 1920.

*) Гл. № 8 „Н. Д.“

Рэформа школы у галоўнейшых культурных краех і працоўны мэтод у выкладаньні фізыкі.

За апошнія 40 гадоў ва ўсім культурным сьвеце зьявіўся й разьвіўся рух, скіраваны да каранёвае рэформы пачатковае й сярэдняе асьветы. Пры гэтым самыя розныя цячэньні педагагічнае й навучнае думкі прыводзяць у гэтым пытаньні да аднае ідэі—да працоўнага мэтоду выкладаньня ўсіх навук, а ў першую чаргу натуральна-гістарычных з фізыкаю на чале. Сярод розных кірункаў мы адзначым нова-псыхічны, утылітарны і чыста-педагагічны.

Першы кірунак ёсьць рэзультат галоўным чынам прымяненьня экспэрымэнтальнага (дасьледнага) мэтода да псыха-

лёгіі й педагогікі, прычым схэматычны ход развагі прыхільнікаў гэтага кірунку такі. Згодна з экспэрымэнтальнымі данымі, ўсякае здабываньне веды, ці ўспрыйманьне ёсьць арганічны працэс, ў катором фактычна прыймаюць вучасьце ня толькі нэрвова-мазгавыя асяродкі (цэнтры), але й увесь эрганізм чалавека да мускулаў уключна. Кіруючы па вядомым парадку фізычнай і мускульнай дзейнасьцю дзіцяці, мы можам стварыць найлепшыя варункі для ўспрыйманьня, ці для здабываньня веды. Найболей натуральным спосабам зьяўляецца выкарыстаньне дзіцячае цікавасьці да надворнага рэальнага сьвету, а таксама й патрэбнасьці майстраваць, клеіць, рысаваць і т. д. Дзеля гэтага даволі даць дзіцяці магчымасьць паступова самаму выведаць усё абкружаючае ўласнаю працаю й сваімі рукамі. Пры гэтакай самастойнай працы к звычайным зрэнкавым і слыхавым пачуваньням прылучаюцца вобмацкавыя й мускульна-рухавыя, з чаго прадстаўленьні дзіцяці становяцца болей поўнымі. Такім чынам, зьявілася патрэбнасьць перанесьці выкладаньне з клясы ў адкрытае поле, лес, сад, дзе дзеці сачаць за жывою прыродаю і зьявамі надворнага сьвету, і ў лабараторыю (працоўню), дзе яны дасьледуюць. У гэтых працоўнях дзеці робяць розныя работы,—сталярныя, сьлясарныя, лепныя, мерацельныя й г. д. і зусіх бакоў зразумяваюць выкладаны матар'ял і палягчаюць сабе яго разуменьне. Гэта самадзеяльнасьць ня толькі практыкуе органы надворных пачуцьцяў дзіцяці, але грымушаець яго разважаць і пробаваць свае развагі на дзеле. Дзякуючы гэтаму, разьвіваецца думанне і воля вучня. Вядомы энтузіаст працоўнага мэтода выкладаньня В. Мроген гаворыць:

„Чаго ня здолее зрабіць дзіця з простым кавалкам паперы! Сколькі індывідуальнасьці яно ўкладае ў гэта! У аднэй з школ Нью-Іорка вучням 8-11 гадоў было дадзена зрабіць стол з кускоў кардона аднае й тае-ж формы, а затым прымацаваць яго. І вось у клясе з 32 вучняў аказалася 22 розныя формы!"

Дзеля гэтага даўнейшая нагляднасьць пры абвучэньні, якая вялася ад зрэнкавых пачуваньняў да стварэньня бачаных досьледаў альбо прадметаў і памагала здабываньню пераймальных (падражацельных) прызвычак, павінна даць першае месца працоўнаму прынцыпу, які вядзе да ўсе-баковага зразуменьня рэчы, да яе вырабкі, да самастойных прызвычак. Дзеля гэтага, не даволі карыстаньня пры абвучэньні гатовымі мадэлямі й начыньнямі, але само дзіця павінна з адпаведных матар'ялаў пры падмозе інструмэнтаў і паказак кіраўніка зрабіць мадэль альбо начыньне й затым ужо зразумець яго прыметы (свойствы) альбо адпаведныя зьявы. Такім чынам, школа павінна зрабіцца майстэрняю, а запамінаньне павінна аддаць сваё месца агульна-асьветнай працы, якая, як відно, будзе адпавядаць запытаньням дзіцяці і дасьць яму ўнутранае здаваленьне. Адсюль зьяўляецца ў дзіцяці любоў да працы, якой цяпер саўсім няма ў школе. „Дарога да розуму йдзе праз вочы й рукі"; „болей чакаць, болей даваць ініцыятывы самім вучням, заўсёды помніць, што млыны багоў працуюць паволі"— вось такія асновы гэтага цячэньня педагагічнае думкі. Пачаткі сваіх думак прыхільнікі гэтага вучэньня знаходзяць у словах „ВялікаеДыдактыкі" Амоса Коменскага (1592—1620 г. г.): „Школы ёсьць нішто іншае, як майстэрні, дзе кіпіць праца". І ў завеце Русео: „Вучыце, але й дазвольце вашым вучням вучыцца, думаць і працаваць."

А. Дмахоўскі.
Інспэктар 1-е Віленск. Бел. Гімназіі

(Далей будзе).

Па разбураных мясцох Беларусі.

6 жніўня (аўгуста) 1915-га года, адступаючы ад Варшавы з N. палявым шпіталем, я залучыў ў сваю родную вёску Катлы, якая знаходзіцца за 5 вёрст ад гавятовага места Бельска (Горадзенскае губэрні). Катлоўцы толькі што выехалі, і іхны абоз болей чым на вярсту расьцягнуўся за вёскаю.

Ніколі ня згладзіцца з памяці абраз, які мне тады прадставіўся: усьцяж зарава пажараў на заходзе—то шугалі полымем сёлы і вёскі ў баявой лініі, зблізаецца гарматны гул, і мора, мора абозаў, салдатаў, бяжэнцаў, скаціны. І ўсё рушыцца ня толькі па дарозе, але проста церааз поле, па ніве, якая ў той час ня ўсюды яшчэ была ўбраная.

Здавалася, сунецца страшэнны агнявы віхор, ад якога нікому ня можа быць ратунку. Застацца на месцы, гэта ўсё роўна, што аддаць сябе на поўную гібель, думалі тады, і вось чаму ўсё жывое, усё, што магло рушыцца, імкнулася ўцячы далей, далей ад гэтага вагнявога гурагану.

Я відзеў тады плак ня толькі жанчын і дзяцей, я відзеў, як дарослыя мужчыны, якія здаваліся зусім зачарсьцьвелымі, як і яны галасілі, як дзеці, пакідаючы вякамі наседжанае месца і мазалямі рук сваіх здабытае дабро.

У сябе ў даму я засьпеў салдатаў. То былі абозьнікі нейкага палка. Яны гатавалі ежу. Некаторыя гаспадарылі ў садзе каля вульляў. Брат мой, выяжджаючы, пакінуў у вульлях зімні запас мёду, наіўна ўважаючы, што ніхто не захоча пакрыўдзіць божае стварэньне—пчолку. Я заскачыў, як вульлі былі ўжо разьбітыя і разбураныя. Адзін з салдатаў ганяўся па двары за курыцаю.

Сьлёзы душылі мяне і вялікіх высілкаў мне каштавала, каб тут-жа не загаласіць.

Два месяцы пасьля, у сьцюдзёны мокры кастрычнік (акцябар), шукаючы родных, я пабываў у Баранавічах і Менску. Усе ваколіцы гэтых местаў, на дзесятак вёрст навокала, былі ўсьцяж тады заняты бяжэнцамі. Тут іх было не дзесяткі, а сотні тысячаў. Галодныя, халодныя, без страхі і бяз прытулку, сярод чыстага поля яны кучкамі грэліся ля мокрых вогнішчаў. Сьмяротнасьць сярод дзяцей ужо тады была страшэнная. Нябожчыкаў хавалі тут-жа ў полі, стаўляючы на могілцы невялічкі драўляны крыж.

Праяжджаючы потым па Аляксандраўскай зялезнай дарозе я відзеў тысячы гэткіх крыжоў. Баранавічы—Менск—Смаленск і Масква гэта ёсьць дапраўды вялікі крыжавы шлях няшчасных беларусаў Горадзенскае губэрні.

З тых пор мінулася болей за пяць гадоў. Я йзноў у родных мясцох. Вось Бельск, гдзе працяклі першыя гады майго вучэньня. Ен мала пацярпеў ад вайны. Згарэла ўсяго некалькі дамоў у цэнтры ля ратушы. Наагул места тое-ж самае, якое было і да вайны; толькі польскія вывескі гавораць аб новых валадарох краю.

Кірујуся да свае вёскі Катлы. Убаку відаць в. в. Праневічы, Відава. Будынкі відаць на ўсім працягу вёсак; значыцца, пажар іх не захапіў. Падходжу да вельмі мне знаёмай вёскі Белай (за 4 вярсты ад Бельска). Я памятую яе навенькія, чысьценькія будынкі з чырвонымі чарапічатымі дахамі, з густою зелянінаю наўкола. А дзе-ж яны? Груды каменьня і ўсялякага шумецьця, цяпер завеяныя сьнегам, ды троху дзе пакінутыя, абгарэлыя і засохлыя дрэвы, ды галубы каменны крыж ля дарогі з уцалелым надпісам: „Сахрані і спасі рабоў Божых Луку і Параскеву"—гавораць, што тут некалі жылі людзі.

Направа і налева ад вёскі, уздоўж ракі відаць лінію акопаў, якія засталіся ад 1915 г. Кажуць, што тут былі ўпорныя бітвы, расейцы некалькі дзён адкідалі насядаўшых аўстра-немцаў і толькі абхват флангаў прымусіў іх адступіць. Гэта падцьвярджаюць знарады, якіх тут знаходзяць дужа многа. Стаяўшая сьпераду акопаў, на ўзгорку царква згарэла ад падпаляючых непрыяцельскіх знарадаў, бо ёю карысталі расейцы, як аглядным пунктам.

Падхажу к Катлам. Мімаволі шыбчэй стаўляю ногі—гэтак хочацца барджэй даведацца, што сталася з вёскаю, ці вярнуўся хто? Віджу дамы, ды ўсё бяз вокнаў і дзьвярэй. Няўжо дагэтуль ніхто не вярнуўся? Іду далей і прыкмячаю, што ўюцца ад комінаў дымкі; значыцца жывуць. Захаджу ў першую хату. Мяне пазналі. Пытаюся пра родных.— „Вярнуліся, але ня ўсе",—кажуць мне. Ня баўлюся, сьпяшаюся да сваіх.

Амаль не на палову вёска зьнішчана пажарам. Згарэла ўся левая старана вуліцы, калі ісьці ад Бельска. Гумны зьнішчаны на дзьве трэці, толькі пасярэдак ухаваўся. Уцалела й школа, што была даўней прыгажэствам вёскі. Ды цяпер, бяз вокнаў і дзьвярэй, яна моцна засмучаець сваім выглядам.

Вярнуліся дагэтуль 42 сям'і (выехала ўсяго 98 сем'яў). Але як вярнуліся? Старыя й дзеці блізка што ўсе паўміралі ў дарозе. Ну, ніводнае сям'і няма, якая-бы ўся вярнулася. З дзевяцёх душаў сям'і майго брата Зьмітрака вярнулася толькі шэсьць. Сам ён улетку 1919 г., калі варочаўся з Тамбоўскае губэрні, захварэў у дарозе на плямісты тыфус, і яго зьнялі ў Воршы з цягніка (поезда) і павязьлі ў заразны барак. Эшалон ня мог яго чакаць, і сям'я вярнулася дамоў без гаспадара. Дагэтуль жонка й дзеці ўсё яшчэ чакаюць свайго бацьку. Я ня мог пазбавіць іх гэтае надзеі.

Шмат паўмірала ўжо вярнуўшыся, галоўным чынам ад тыфуса. Памёрлі Пацэвіч, Жукоўскі, Гаўрылюк, людзі саўсім яшчэ маладыя. Ад сям'і Карніла Сахарчука, сям'і у 10 душ, застаўся толькі 1. Некаторыя сямействы саўсім павымяралі.

Большасьць паварочаных надта гаруе, бо ня мае ані каня, ані каровы. Некаторыя з прыехаўшых у 1918 г. ужо абзавяліся былі й коньмі й калёсамі, але ўлетку, адступаючы, бальшавіцкае войска пазабірала і тое і тое. Цяпер усяго некалькі шчасьлівейшых маюць коні. Тымчасам поле моцна ўдзірванела і насілу паддаецца ўрабляньню. Дужа нямногім задалося пасеяць 7-10 пудоў жыта па зіму.

Трапілась даведацца, што самым цяжкім часам дзеля паварочаных бежанцаў была зімка 1918-1919 г. Калі-б не амэрыканскія камітэты помачы, то ўсе-бы ўцалелыя ад даўгіх тулянньняў па сьвеце дзеці напэўна не перажылі-б гэтае зімы, загінуўшы ад голада і хваробаў. На жаль, гэтае падмогі цяпер тут болей не даецца. Кажу—на жаль, бо і цяпер яшчэ надта многа дзяцей тут галадуе.

Сапрон Каверда.

(Канец будзе).

Узьбіліся на свой шлях.

Адраджэньне Беларусі, як вядома ўсім, стала расьці з кожным часам шырэй з 1905 года. Саўсім зразумела, што працаваць пад уладаю расейскага імпэрыялізму магчыма было, і то з надта вялікімі перашкодамі, толькі на культурна-прасьветнай дарозе. Такая праца вялася аж да рэвалюцыі 1917 года. Трэба заўважыць, што, ня гледзячы на царскі рэжым, беларускія адраджэнцы досіць часта бывала з культурна-прасьветнае працы пераскаквалі й на палітычную, за што й адседжвалі ў каталажках. З часоў рэвалюцыі 1917 года справа беларуская стала шырыцца ўжо не з гадамі, а навет з кожным тыднем. То былі толькі арганізацыі ў мястох вялікіх: Вільні, Менску, а гэта ўжо сталі зьяўляцца розныя беларускія гурткі па павятовых мястох і мястэчках. Дзеля таго, што пасьля гэтае рэвалюцыі стала крыху вальней, праца беларуская пайшла не па аднаму ўжо шляху, а распаўзлася ў розныя кірункі й разплаўсюдзілася амаль не па ўсёй Беларусі.

Мне вельмі хочацца пазнаёміць паважаных чытачоў з тым, як узьбіліся беларусы Случчыны на свой шлях і да чаго яны дайшлі.

Беларуская арганізацыя на Случчыне стала падымацца на ногі з пачатку Расейска-Нямецкае вайны. Праўда, былі людзі, каторыя працавалі й да гэтага часу, але іх было вельмі мала. Вось у вайну нехта Астроўскі адчыніў беларускую гімназію, але гэтая гімназія тады звалася не беларускаю, а проста земскаю гімназіяю. Сам дырэктар гімназіі пан Астроўскі ў той час быў надта шчыры працаўнік на ніве бацькаўшчыны, дзякуючы гэтаму, ён і паставіў справу беларускую ў гімназіі на свае ногі. Кіраваў ён гэтаю гімназіяю, здаецца, да бальшавіцкае ўжо рэвалюцыі. Потым пан Астроўскі якім-та парадкам, пунктуальна не скажу, папаў у Дэнікінскую армію. Там ён сапсаваўся дарэшты, саўсім стаў другім чалавекам. Пра Беларусь і ўспамінаць ня хоча, навет родным сёстрам-гімназісткам забараніў пры ім гаварыць пабеларуску. Але, ня гледзячы на гэта, пан Астроўскі мае свае заслугі ў тым, што з яго вучняў-гімназістаў шмат выйшла сьвядомых беларусаў, дзякуючы якім усё сялянства Слуцкага павету зразумела, хто яны такія, і цяпер кожны селянін Случчанін, стары й малы, вам сьмела скажа, што ён і не масказь і не паляк, а кроўны беларус.

Вось улетку 1917 года адчыняецца беларускі культурна-прасьветны гурток „Зарніца" у вёсцы Старыцы. З дзеячоў гэтага гуртка адцемлю Аляксея й Янку Каўпакоў, Пётру й Янку Зянюкоў, Л. Стаганавічанку, Зенькавічанку й Пётру Бабарэку. Статут апрацаваны гуртком „Зарніца" быў потым прыняты Беларускім Нацыянальным Камітэтам Меншчыны.

У восень 1917 года адзін з вучняў гімназіі Астроўскага С. Бусел задумаў арганізаваць культурна-прасьветны гурток „Папараць-кветку". Шукаў ён сабе сябрукоў сярод інтэлігенцыі, але да каго не зьвяртаўся, усюды чуў адно; выкінуць з галавы гэтую дурную думку. Нарэшце ён спаткаў аднаго вучня, ня ведаю якое школы, гр. Ракуцьку, які далучыўся да яго — й пачалі супольную працу. Гэты Ракуцька хацеў, каб гурток „Папараць-кветка" быў на камуністычнай падкладцы, але Бусел не згадзіўся. Дзеля таго, што яны не знайшлі сабе балей сталых сяброў, дык С. Бусел прымусіў вучняў віжэйшых клясаў прыйсьці на першы сход, каб выбраць праўленьне гуртка. Бальшавікі дазволу на сход не далі, тады гэта куча дзяцей-вучняў рэвалюцыйным парадкам адчынілі сход і выбралі праўленьне, толькі ўжо гэты гурток назвалі не грамадзянскім, як раней думалі, а вучнёўскім культурна-прасьветным гуртком, бо, як я казаў, саўсім ня было спачуваючых беларускаму руху сталых людзей. Потым, калі вучні-сябры гуртка задумалі зрабіць першае йгрышча, дык усе Слуцкія музыканты адмовіліся пайсьці пайграць на гуляньні беларускае моладзі. К гэтаму часу прыехаў звольнены з войска вядомы беларускі дзеяч на Случчыне В. Русак. Ен быў у беларускіх арганізацыях на Віцебшчыне. Вось гэты В. Русак памог вучням паставіць, як сьлед, гэтае першае йгрышча Слуцкае моладзі.

Потым ў склад сяброў гуртка сталі запісвацца некаторыя зацікаўленыя грамадзяне, як напрыклад: вядомы беларус, які працуе з 1905 года, п. Асьвяцімскі, Жаўрыд і йншыя. Такім чынам гурток „Папараць-кветка" існаваў увесь час нямецкае й бальшавіцкае акупацыі на Беларусі. Далей у кастрычніку 1919 года, калі гурток перапоўніўся сталымі людзьмі, дык зрабілі перарэгістрацыю гуртка, значыцца адкінулі ўсіх дзяцей і назвалі ўжо гурток грамадзянскім. З працаўнікоў гэтага ўжо новага гуртка шчырымі беларусамі зьявіліся: А. Бараноўскі, У. Дубіна, Фёдараў і іншыя. Неўзабаўкі загэтым Беларуская Школьная Рада Меншчыны прыслала на Слуцкі павет інструктарам беларускіх школ нейкага п. Абрамовіча, каторы заняў сабе пасаду пісара ў польскага інспэктара й заўсім забыўся на даручаныя яму Беларускаю Школьнаю Радаю Меншчыны абавязкі. Тады Рада Мен. прыслала другога інструктара Ю. Лістапада, які да працы аднёсся прыхільна й адчыніў восем (8) пачаткавых беларускіх школ на павеце. У палавіне лістапада (наябра) таго-ж году сябры гуртка „Папараць-кветкі, атрымаўшы інструкцыю з Менска, назвалі сябе ініцыятыўнаю групаю й сазвалі сход прыхільнікаў беларускага руху, каб выбраць Беларускі Нацыянальны Камітэт Случчыны. На сход зьявілася толькі шаснаццаць (16) асоб, якія й выбралі Б. Н. Кам. Случчыны, у склад якога вайшлі гэткія асобы: Пракулевіч, Петрашкевіч, Асьвяцімскі, Бараноўскі й Русак.

Камітэт распачаў сваю працу, але працаваць было вельмі цяжка, бо ня было ніякае дапамогі ніадкуль. Камітэт выпрасіў пазваленьні ў Старасты павету адчыніць пры Камітэце „Бюро безработных" і аднадзеннага збору ахвяр на ўсім павеце. Як раз гэтымі безработнымі і былі сябры „Папараць-кветкі", і Камітэту.

Гурток, трэба заўважыць, кожны сьвяточны вечар ставіў прадстаўленьні. Зборы заўсёды былі вельмі вялікія. Навет ставілі такія вечары, на каторыя вясковае грамадзянства мела права прыходзіць дарэмна бяз платы за ўваход. Усёю гэтаю сэкцыяю кіраваў В. Русак, які паставіў ужо балей за тысячу вечароў. Тым часам гурток „Папараць-кветка" выдаў два нумары часопісі «Наша каляіна», якія вельмі добра разыйшліся сярод сялянства. Вось такім парадкам Н. Камітэт і гурток разжыліся на грошы. Яшчэ арганізацыі Случчыны гэтым не засталіся здаволены, а папрасілі «Хор Тэраўскага» з Менска прыехаць у Слуцак і паставіць што-кольвек. Тэраўскі з хорам не адмовіўся кабыць у Слуцку і навет згадзіўся пяяць на абедні у Слуцкім саборы. Людзей была паўнютка царква, усіх гэта перш-на-перш надта зьдзівіла,

а потым і вельмі зацікавіла. Многія кабеты стоячы ў царкве плакалі, а выйшаўшы гаварылі, што яны думалі пра беларусаў абмылкова, аж выявілася, што й яны тыя самыя беларусы, бо яны чулі, што сябры хору так сама гамоняць паміж сабою папросту. Потым п. Тэраўскі з хорам даў адзін вечар-канцэрт, а другі спэктакль. Прысутных было гэтулькі, што ня толькі нельга было сядзець, а навет павярнуцца немагчыма было.

Ю. Лістапад.

(Працяг будзе).

Мой скарб.

Не пакінуў бацька годны
Мне палацаў ні дабра,
Сам ня бачыў век у вочы
Золата ні серабра.
Толькі родная матуля
З нараджэньня мне дала,
Што дагэтуляй ні куля
Ні бяда не адняла.
Сэрца мяккае у грудзях
Падарыла мне яна,
У ім адбілась як у люстры
Наша бедна старана.
Сэрца з роднага абшару
Сабірае да грудзей
Сьлёзы, жаль, няшчасьце, гора
Што па краю так гудзе.
Грамадой сабраўшысь цеснай
У яго яны, а там
Выліваюцца у песьню
Для чутна усім людзям
Песьня гору і няшчасьцю
Як бы робіцца вянком,
Як гірляндаю дзіцятку,
Як нявесьце валюшом.
Дык прымі жа, сьвет вялікі,
Гора, ўбранае у валь,
Клікі змучанага сэрца,
Вылітыя ў песьню-жаль.

Ігнат Дварчанін.

Крыніца.

За ракамі, за гарамі,
За хваёвымі барамі
Есьць празрыстая крыніца.
Усе атруты, ўсе пакуты
З сэрца людзкага, бы путы,
Зьнімець дзіўная вадзіца.
Лечыць цела, што збалела,
І душу, калі змарнела,
Сілу, веру лье у грудзі...
І часамі, і гадамі
Да яе ідуць палямі
Горам зломаныя людзі.
Толькі трудная дарога
Да не, нібы да Бога:
Іншым—сьмеласьці і сілы
Не хапае... з паўдарогі
Іншых пушчы і разлогі
Варачаюць... тых—забілі
Сьлёзы, гора і заботы,
Думкі горкай адзіноты...
Тых—веру ўжо згубілі
У зваю долю, ў свае сілы,
У сілы дзіўнае крыніцы.
А бяз веры, стой дзень цэлы,
А ня дасьць здароў'я целу
Брыльлянцістая вадзіца.
Ды ня лёгка і далёка
Й тым, хто вераць глыбока
Дашукацца тэй паляны,
Гдзе на сонцы ў глыб—старонцы
Уецца рэчка ў даль бяз концу,
Гоіць душу, гоіць раны,
Над вадою, над жывою
Гдзе ківаюць галавою
З ласкай стромкія бярозкі,
Гдзе на словы людзкай мовы
Сьвежы, сонечны, бы новы,
Лес шлець згукі, адгалоскі...
Слабы, хворы ў цішы скора
Свае болькі, свае гора
Позабыўшы, ўстрапянецца:
Сілы—дасьць яму крыніца,
Веру—сонца што іскрыцца,
Сьмеласьць—неба, што сьмяецца.
Лес яму аб волі, долі,
Зашапоча, што раз болі,
Прымірыць з жыцьцём нямілым...
У неба гляне і устане
Зноў з надзеяй на змаганьне
Верны сын зямелькі шчырай.

Натальля Арсеньнева.

Ліга Народаў і Беларусь.

(Ад уласнага карэспандэнта).

ПАРЫЖ, 28 лютага. Сюды прыбыла Дэлегацыя Ураду Беларускае Народнае Рэспублікі у складзе: Міністра Заграмічных Спраў Ладнова, Міністра Справядлівасьці Цьвікевіча, Радніка Лур'е, а такеама тэхнічнага пэрсаналу. Дэлегацыя паміж іншых урадовых даручэньняў мае мэтай дабіцца на парыжскай канфэрэнцыі Лігі Народаў, каб плебісцыт адбываўся на усей беларускай тэрыторыі, адыйшоўшай да палякоў паводле расейска-польскай мірнай угоды.

Арэшты эс-эраў у Савецкай Беларусі.

(Ад нашага карэспандэнта ў Рызе).

Заграмічны Камітэт Беларускай Партыі Социялістаў-рэвалюцыянэраў дастаў паведамленьне, што у Менску каля 20-го лютага адбыліся арэшты беларускіх эс-эраў. Сярод паняволеных знаходзяцца: *Трахімаў, Мамонька, Бадунова, Маркевіч, Злоцкі, Чаржынскі* і яшчэ 180 партыйных сяброў.

Хваля арэштаў з Менску перакінулася праз усю Усходнюю Беларусь аж да Смаленска ўключна.

Асабліва вялікія арэшты адбіліся ў Слуцку, Бабруйску і Ігумену, дзе арыштавана каля 900 чалавек эс-эраў, тое-ж самае зроблена і ў Віцебшчыне і Магілеўшчыне, дзе заарыштована больш за 300 чалавек.

Трэба адзначыць, што беларускія дзеячы правейшага палітычнага кірунку асталіся там у гэты час на волі.

Усіх арыштованых перавозяць у маскоўскую Бутырскую турму.

Газэта беларускіх эс-эраў „Змаганьне", якая друкавалася ў Менску, зачынена.

Прычына арэштаў—боязьнь маскоўскіх камуністаў адкрытага выступленьня арганізаваных эс-эрамі беларускіх мас за незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі.

Праца беларускіх эс-эраў за граніцай.

(Ад нашага карэспандэнта ў Празе).

ПРАГА, 26 лютага. Сюды з Коўні, праз Бэрлін, прыбыў лідэр Беларускай Партыі Социялістаў-рэвалюцыянэраў Тамаш Грыб дзеля інфармаваньня эўропэйскіх социялістычных партыяў аб сучасным палітычным, экономічным і социяльным станозішчы Беларусі. Затым Грыб праедзе ў Вену з той-жа мэтаю, а стуль і ў другія гарады.

Ад'езд Ластоўскага.

(Ад нашага карэспандэнта ў Коўні).

КОЎНЯ, 27 лютага. Гэтымі днямі Старшыня Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі грамадзянін В. Ластоўскі выяжджае у Рыгу дзеля перагавораў з Урадам Лацьвійскай Рэспублікі. Падарожы Ластоўскага ў беларускіх палітычных кругах прыдаюць вялікае значаньне.

Выпіска з пратаколу

ПАСЕДЖАНЬНЯ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАМІТЭТУ
28 лютага 1920 г.

Слухалі даклад аб Сямашку, міністру беларускіх спраў у Літоўскім Урадзе.

Пастанавілі:

Падцьвердзіць ранейшую рэзалюцыю Нацыянальнага Камітэту аб *зьмене міністра Сямашкі*, якую і перадаць літоўскім прадстаўнікам.

Ад Рэдакцыі. Маем неофіцыяльныя весткі, што па пасаду беларускага міністра ў Літоўскім урадзе беларускае грамадзянства Літвы выстаўляе кандыдатуру вядомага дзеяча К., быўшага да вайны інспэктарам аднэй віленскай гімназіі, а цяпер займаўшага дужа вялікую пасаду ў дыплёматычным корпусе ў Грузінскай рэспубліцы. Кандыдат на міністра карыстаецца шырокімі сымпатыямі тутэйшага насяленьня ўсіх нацыянальнасьцяў і мае ўплывы сярод палітычных літоўскіх кругоў.

Палітычны агляд.

Самымі буйнымі палітычнымі выпадкамі апошніх дзён зьяўляюцца Франка-Польскі злуч (саюз), вайна Грузіі з Савецкаю Расеяю й Лёнданская канфэрэнцыя.

Франка-Польскі злуч направлены галоўным чынам працiў Нямеччыны й Сав. Расеі. Праўда, Нямеччына пакуль што агульнымі сіламі зваявана й разброена, але, марнуючыся пад цяжкімі, нявытрываными ўмовамі Версальскага міру, яна толькі чакае падхадзячага мамэнту, каб ізноў узяцца за аружжа. Пры гэтым яна спадзяецца на падмогу Сав. Расеі. Пакуль у Расеі жыў Калчак, Дэнікін, Врангель, Эўропа не баялася, што бальшавікі павядуць наступ на Захад. Але цяпер у іх тыл слабодны. А палітычныя выпадкі на Захадзе цяпер складваюцца такім чынам, што Францыі, здаецца, дастанецца адной адбіваць бальшавіцка-нямецкую апаснасьць, дзеля таго што Амэрыка, незадаволеная Версальскім мірам, каторы быў зроблен ня так, як яна хацела, і каторага яна не прызнае, адкалолася й гатова навет заключыць асобны мір з Нямеччынаю, каб аслабадзіць сабе рукі працiў Японіі на Далёкім Усходзе. Для Англіі-ж Нямеччына бяз флота ня страшна, апроч таго, яна свой апэтыт ужо крыху здаволіла на рахунак нямецкіх калоній і флота, нарэшце яна вельмі занята уласнымі справамі — Ірляндыяй, з катораю яна вечна грызецца, як кот з сабакам, і Усходам, катораму пагражаюць бальшавікі сваею прапагандаю. Значыцца, спадзявацца Францыі на падмогу Амэрыкі й Англіі на выпадак новага наступу бальшавікоў ня прыходзіцца. У гэтым Францыя мела выпадак увераіцца ў мінулым годзе, калі бальшавікі напалі на Польшчу і калі да яе, апроч Врангеля, ніхто ня прыйшоў на падмогу. Але Врангель Польшчу абараніў, а сам згінуў. І Францыі прыйшлося падумаць над тым, кім-бы яго замяніць.

Яна спачатку думала стварыць так званую Малую Антанту, ці злуч з Польшчы, Чэха-Славіі, Вэнгрыі й Румыніі. Але гэты плян ня ўдаўся. Тады прыйшлося пакуль што заключыць злуч з аднэю Польшчаю. А Польшчы гэты злуч так сама вельмі на руку, бо яна цяпер пасьля 7-мі гадовае вайны знаходзіцца ў вельмі цяжкіх палітычна-экономічных варунках, як прызнаўся ў гэтым у Парыжы сам польскі міністр чужаземных спраў кн. Сапега. У яе на чарзе дня стаяць яшчэ не разьвязанымі пытаньні Сілезскае, Данцыгскае й Літоўскае, а на Рыжскі мір складваць вялікіх надзей ня прыходзіцца.

У сілу гэтых становішчаў і быў заключаны Франка - Польскі злуч, зложаны з трох умоваў: 1) Палітычнае, абавязваючае францыю даваць падмогу Польшчы вайсковымі матар'яламі й тэхнічнымі срэдствамі ў выпадку нападзеньня на яе з усходу альбо захаду, але пасылка войска выключаецца. Польшча з свайго боку так сама павінна памагаць Францыі ў выпадку патрэбы. 2) Гандлёвая умова і 3) Спецыяльная умова на конта нафцяных дабыткаў ў Галіцыі.

Да вайны з Грузіяю Сав. Расея пачала гатовіцца адразу пасьля пабеды над Врангелем і заключэньнем пераміра'я з Польшчаю. Грузія увесь час была бяльмом на воку у бальшавікоў, дзякуючы таму, што яна знаходзілася пад упывам спачатку Амэрыкі, а затым Англіі, слабодна гаспадарыўшае ў батумскім парту й жадаючае прыбраць да сваіх рук бакінскія нафцяныя промыслы, як вядома, самыя багатыя ў Эўропе і без каторых Расея жыць ня можа. Спачатку Сав. Расея зрабіла бальшавіцкі пераварот ў Арменіі й Азербейджане, суседніх рэспубліках з Грузіяю на Каўказе, а затым разам з Армянскімі войскамі напала зусіх бакоў на Грузію.

Па апошніх вестках з грузінскіх крыніц, грузіны аб'явілі ў сябе агульную мабілізацыю і пакуль абараняюцца даволі усьпешна: адбілі першы націск на Тыфліс і ўзялі 2,000 палонных. Але ўсё-такі трудна спадзявацца на поўную пабеду Грузіі, калі ня зьменяцца палітычныя варункі на яе карысьць карэнным чынам, бо вельмі няроўныя сілы, а спадзявацца на рэальную дапамогу з чыйго-небудзь боку ня прыходзіцца. Праўда Варшаўскі Сойм выказаў пратэст проціў нераломнага нападзеньня баль-

шавікоў на Грузію, але ад гэтага самага Грузіі ні холадна, ні горача.

Лёнданская канфэрэнцыя мае дзьве задачы: 1) Прымусіць Нямеччыну выплачваць наложаную на яе кантрыбуцыю і 2) урэгуляраваньне Усходняга (Турцыя) пытаньня.

Ня гледзечы на тое, што у **Нямеччыне** ўжо **Францыя** і **Англія** забралі блізка ўсё, што толькі можна — зброю, ваенна-гандлёвы флот, частку, жывёлы, золата і г. д.,—французы яшчэ ўсяго гэтага мала. Апэтыт разьвіваецца з ядою. І вось яны, ці галоўным чынам Францыя, а затым Англія хочуць на гэтай канфэрэнцыі прымусіць Нямеччыну падпісаць новыя ўмовы выплаты дальнейшае кантрыбуцыі, а калі апошняя адкажацца, дык грозяць ей рэпрэсіяй, ці спачатку заняць частку Нямеччыны, а затым чуць-што не пачаць новую вайну. Але Нямеччына, узяўшы пад увагу сучаснае палітычна-экономічнае становішча, каторае хіба не дазволіць навет Францыі пачынаць новую вайну, пакажа на гэтай канфэрэнцыі вялікае супраціўленьне. Яна, паміж іншым, ставіць галоўнаю умовай далейшай выплаты тое, каб Сілезія, з-за каторае йдзе спрэчка паміж ёю й Польшчаю й з-за каторае назначана галасаваньне на 20 сакавіка (марца), каб Сілезія засталася за ею, У цяперашні час ва ўсёй Нямеччыне йдзе вялікая агітацыя проціў саюзьнікаў. Усе блізка нямецкія міністры раз'язджаюць па Нямеччыне з агітацыйнаю мэтаю. А нямецкі друк пагражае навет манархічным пераваротам, калі нямецкая улада згодзіцца на новыя умовы выплаты кантрыбуцыі.

Так-жа справа стаіць і з **Турцыяю**. Словам, Версальскі дагавор расшываецца, аж трашчыць.

Турэцкае сялянства Малае Азіі пад кіраўніцтвам Кемаль-пашы ня прызнала мірнага дагавору, насільна заключанага ў Сеўры (ва Францыі), і распачало проціў Францыі і **Грэцыі** ваенныя дзеяньні. Яно стварыла новую уладу ў Ангоры, якая ня прызнае Кастантынопальскае ўлады. Каб ня даць гэтаму пажару разгарэцца і распаўсюдзіцца далей, саюзьнікі запрасілі на Лёнданскую канфэрэнцыю турэцкіх прадстаўнікоў абедзьвюх уладаў і гатовы наладзіць стары мір, хоць гэтым нездаволена Грэцыя, каторая ўвесь час стрымлівала турэцкі напор.

—У Сав. Paтei, згедна з апошнімі тэлеграфнымі весткамі, успыхнула новая хваля паўстаньяў і беспарадкаў. У Петраградзе быццам паўсталі кранштацкія матросы з рабочымі, а ў Маскве рабочыя, да каторых прылучылася частка чырвонае арміі. Паўстаньне яшчэ не задаўлена.

Такіх вестак за тры гады бальшавіцкага праўленьня мы чулі ня мала. Вядома, няма дыму без агню. Але ня варта вельмі верыць ім.

У Польшчы, у відзе пратэста проціў мілітарызацыі чыгунак і ўстановы ваенна-палявых судоў для бастуючых, вызваных частачнаю забастоўкаю чыгунак Варшаўскага вузла, забастовачны камітэт чыгуначнага сваюзу аб'явіў агульную чыгуначную забастоўку. Забастовачны камітэт цэнтральнага камітэта прафэсіянальных саюзаў адначасна аб'явіў ва ўсей Польшчы двух-днеўную агульную забастоўку пратэста на 28 лютага й 1 сакавіка (марца).

Ш.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Пятніца, 25 лютага 1921 г.

× Спаўняючы камітэт Расейскага Установчага Сойму пратэстуе супроць Рыжскага дагавору, які аддае Польшчы беларускія землі.

× Памёр у Нью-Іорку знамяніты італьлянскі пяюн Карузо.

× Слуцкая „чрэзвычайка“ раскрыла загавор Беларускага Народнага Камітэту, арганізаваўшага паўстаньне супроць маскоўскай акупацыі.

Субота, 26 лютага 1921 г.

× Лацьвія і Эстонія прызналі Літоўскую рэспубліку дэ юрэ (па праву).

× У Рэўлі адбываецца зьезд прадстаўнікоў балтыцкіх гаспадарстваў.

Нядзеля, 27 лютага 1921 г.

× Ліга Народаў уважае, што плебісцыт у Віленшчыне ня можа быць раней як у ліпні гэтага году.

× У хуткім часе і Фінляндыя мае прызнаць Літву дэ юрэ (па праву).

Панядзелак, 28 лютага 1921 г.

× Газэты пішуць, быццам генарал Жэлігоўскі варочаецца ў Варшаву, а яго месца ў Вільні займець урадуючая рада на чале з генаралам Шаптыцкім.

Аўторак, 1 сакавіка 1921 г.

× У Вене адбываецца міжнародны зьезд социялістаў, якія вышлі з 2 інтэрнацыянала і не далучыліся да 3-га, маскоўскага. На зьезьдзе Фрыдрых Адлер, Отто Бауэр і інш. Ад беларусаў паехаў Тамаш Грыб.

Серада, 2-га сакавіка 1921 г.

× Палкоўнік Шардыны рабіў Лізе Народаў даклад аб Віленшчыне, пасьля якога былі дэбаты, але пастановы ня вынесена.

× На канфэрэнцыі ў Лёндане будзе прынята дэлегацыя Літоўскае Рэспублікі.

× На Валыні выбухнула паўстаньне супроць маскоўскай акупацыі.

× Савецкая дэлегацыя называе няпраўдзівымі весткі аб контр-рэвалюцыі ў Маскве.

× Горадзенскі, Ваўкавыскі і Белавежскі паветы прылучаны к Беластоцкаму ваяводзтву.

Дамаганьні забаставаўшых чыгуншчыкаў у Польшчы.

„Kur. Por.“ падае да агульнага ведама гэткія дамаганьні забастоўшчыкаў:

1. Каб ураз-жа былі спынены рэпрэсіі проці работніцкае клясы і каб былі звольнены ўсе арыштаваныя за палітычныя справы.

2. Каб табель платы была гэтак зьменена, каб плата чыгуншчыкам была-бы прынамся роўна плаце ў аднародных фахах па-за чыгункай (як: мэталісты, будаўляныя работнікі, чыноўнікі і т. п.).

3. Каб множнік дзеля павялічаньня платы быў павялічаны ў паўтара разы, раўнуючы да таго, які кожын раз будзе вызначаны цэнтральным урадовым статыстычным упраўленьнем,

4. Каб лік паясоў паводле дарагоўлі быў паменшаны да двух.

5. Каб аправізацыя для чыгуншчыкаў была такая-ж самая, якую ўрад вызначыў у капальнях.

6. Каб была выплачана дадатковая трынаццатая пэнсія (месячная).

7. Каб ураз-жа выплацілі грашмі рынковую вартасьць недададзеных прадуктаў (дэпутатаў).

8. Каб дзяцей чыгуншчыкаў вучылі-бы дарма.

Колонізацыя у Беларусі пачалася.

ВАРШАВА. „Kur. Por.“ з 27 лютага наказавае:

Сэкцыя сяліб для салдатаў ужо распачала тварэньне гаспадарак для зьдэмабілізованых жаўнераў, якія хочуць самастаяцельна працаваць на ральлі. Ужо вызначаны некалькі гаспадарак.

Цяпер сэкцыя ўмовілася з міністэрствам сельскае гаспадаркі у справе, каб пачаць сячы Белавежскую пушчу дзеля даставы дрэва для гэных гаспадарак. Пастаноўлена закладаць салдацкія сялібы не далей, як за 10 кілёмэтраў ад казённых лясоў, каб гэтак лягчэй была дастава дрэва.

Правінцыяльны аддзел.

М. Клецк, Слуцкага павету.

19-га Студзеня 1921 году у м. Клецку уцякачамі ад бальшавіцкае ўлады са Случчыны пры дапамозе кабет м. Клецку было пастаўлена беларускае ігрышча на карысць чырвонага крыжу. Ставілася вось што: „Міхалка“ і „Мядзьведзь“,—камэдыі, в аднэй дзеі кожная. Публікаю была перапоўнена ўся саля, так што недзе было і стаяць, а ня толькі каб сядзець. Жыхары і жыхаркі засталіся вельмі здаволеннымі пастановаю гэтага ігрышча і прасілі адпаведкага загадчыка ставіць часьцей беларускія ігрышчы, якія дзеля ўсіх панятны. Артысты і артысткі выканалі свае ролі як найлепей.

Як мне вядома, адпаведнаму загадчыку У. Дубяйкоўскаму многа было трудоў знайці беларускія творы дзеля сцэны, але дзякаваць Бога гэтыя творы былі здабыты ім у ксяндза-беларуса м. Нясвіжу, які гэтыя сцэнічныя творы пазычыў на кароткі час. Толькі і можна дастаць беларускіх кніжак у ксяндза, а больш нідзе таму, што Слуцак адрэзан, а бальшавікі увесь час сачаць за тым, каб бэларусы-нацыяналісты са Случчыны нічога не перасылалі ўцякачом, баючыся, як яны кажуць «контр-равалюцыі.» Польская улада перашкод к пастанове ігрышча не рабіла, а толькі камэндат паліцыі м. Клецку Хведзюшын у той самы дзень, калі павінна было адбыцца ігрышча, не пазволіў яго паставіць; ня ведаю прычыны.

У. Дубіна.

М. Відзы (Браслаўскага павету).

Мястэчка нашае, зруйнаванае расейска-нямецкай вайной, пачынае патрошку аджываць. Бываюць рынкі, на якія зьяжджаецца шмат гаспадароў, таксама паказываюцца і гандляры з Вільні, якія парабілі сабе з дошак будкі, бо ў бойкім і пекным калісь мястэчку, няма аніводнага цэлага будынку.

Зьбіраюцца перанесьці ў мястэчка касьцёл і коопэратыў, якія месьцяцца часова ў маёнтку Леаполь. Пад касьцёл правяць будынак плебані, бо наш вялікі і пекны касьцёл, як і царква, пабіты саўсім расейскімі знарадамі.

Жыцьцё ў нас надта цяжкое: ўсё зруйнавана цягнучайся 6 год вайной

Каб завесьці гаспадарку, трэба расплесьці часта 8-10 сажнёвую паласу калючых дротаў, павыймаць глыбока забітыя калы, закапаць 1½-2 сажнёвыя аколы і аграмадныя бліндажы і ямы, павыбітыя знарадамі, трэба пабудавацца, завесьці скаціну і інш.

А тут помачы ніадкуль няма. Нашых коні, замучаных цяжкой працай (часта на 3-4 гаспадары ёсьць адзін конь), б руць у фурманкі і на стойку.

Гаспадар з-пад Відз.

Рэзалюцыя Беларускага Нацыянальнага Камітэту у Вільні на пытаньню аб пасылцы Віленскім Магістратам дэлегацыі у Парыж.

Разгледзіўшы справу пасылкі Віленскім Магістратам дэлегацыі ў Парыж дзеля таго, каб дабіцца прылучэньня Вільні і Віленшчыны да Польшчы, і прынімаючы пад увагу:

1) што Віленскі Магістрат, выбраны пры ненармальных варунках, створаных польскай акупацыяй, атрымаў свае мандаты выключна дзеля вядзеньня гаспадарчых спраў Вільні і ні ў якім прыпадку ня кожа пасягаць на права палітычнага прадстаўніцтва гэтага места;

і 2) што выбары сказанай дэлегацыі зроблены галасамі толькі нацыяналістычнай часткі радных — палякоў, бяз учасьця радных іншых нацыянальнасьцяў і супроць галасоў польскіх социялістаў і дэмакратаў,—

Беларускі Нацыянальны Камітэт горача пратэстуе проці узурпацыі часткай радных суверэнных правоў насяленьня Вільні і Віленшчыны“.

1921 г. 24 лютага.

У тым жа духу вынесен пратэст Часовым Літоўскім Камітэтам у Вільні і напісана заява яўрэйскіх радных Віленскага Магістрата.

Тутэйшае жыцьце

11-га дня гэтага месяца 1-я Віленская Беларуская Гімназія робіць у Мястовай Салі (Вострабрамская, 5) грандыозны спэктакль на карысьць сваіх маламожных вучняў.

× Цэны ў Вільні гэткія: жыта 1100—1200 м. пуд, бульба 320—360 м. пуд, малако да 30 м. за кварту, сыр 70—75 м. хунт, масла 240—280 м. хунт, яйкі 14—15 мар. штука, парасё 300—500 м., дровы - за воз 1200—1600 марак.

× 27 лютага адбылося адкрыцьце ў Вільні рысавальнае школы (Малая Пагулянка, 8).

Віленская біржа (гэльда).

2 сакавіка (марца) 1921 г.

Царскія 500 р.	2300	мар.
„ 100	450	„
„ дробныя	160—350	„
Думскія 1000 р.	700	„
„ 250	520	„
Кярэнкі	130	„
Доляры	865	„
Фунты	3150	„
Франкі	54	„
Нямецкія маркі	1420	„
Осты	1400	„
Савецкія у буйных купюрах па 5 і 10 тысяч за кожную сотню	4¼	мар.

УВАГА!

Усіх паважаных рэдактароў, якім пасылаецца „Наша Думка“ з напісам „абмен“, вельмі просім высылаць і нам свае выданьні.

Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ

Кооп. Друкарня „ДРУК“, Вострабрамская, 5.